ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ

№ 45 (144) 1 - 7 сьнежня 1995 г. Кошт 600 рублёў

ВЫБАРЫ АДБЫЛІСЯ

Ва ўсіх 14 выбарчых акругах Гарадзенскай вобласьці прайшоў першы тур выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савету. Аднак з першай спробы ўдалося абраць толькі двух дэпутатаў. У Ваўкавыскай гарадзкой акрузе N 118 ім стаў суддзя Васіль Скок (беспартыйны), які набраў 51,9 працэнтаў галасоў ад 73,2 працэнтаў прыйшоўшых выбаршчыкаў. У Лідзкай сельскай акрузе N 135 дэпутатам абралі старшыню Лідзкага райвыканкаму сп. Блюдніка, які набраў 79,03 працэнтаў галасоў. У Смаргонскай гарадзкой акрузе N 142, дзе балатаваўся Зянон Пазьняк, нягледзячы на тое, што на выбары прыйшло дастаткова шмат людзей (67,5 працэнтаў) ніводзін з кандыдатаў у наступны тур ня выйшаў. Колькасьць галасоў супраць кожнага кандыдата перавышала колькасьць галасоў «за». Так, Зянона Пазьняка падтрымала 47,05 працэнтаў, а супраць выказалася 52,07 працэнта. Яго саперніка, Сьвятаслава Савіцкага падтрымалі 40,04 працэнтаў выбаршчыкаў, а супраць прагаласавала 59,08 працэнтаў. У гэтае акрузе будуць прызначаны дадатковыя выбары.

У астатніх 11 акругах 10 сьнежня пройдзе другі тур выбараў. Прапануем вашай увазе сьпіс кандыдатаў якія прымуць у ім удзел і працэнт галасоў набраных імі ў першым туры. У дужках пасьля назвы акругі - колькасьць прыняўшых удзел у выбарах людзей.

Гродзенская Болдзінская акруга N 121(79,8 працэнтаў): ***С.Гараеў*** (б/п) - 27,9 працэнтаў; ***Г.Осіпава***(АДПБ) - 20,3 працэнтаў.

Гродзенская Горкаўская акруга N 122(50,5): ***С.Мальчык*** (БНФ) - 26,2 ***В.Бурбіцкі*** (ПКБ) - 21,6

Гродзенская Дзяржынская акруга N 123(54,1): ***Ч.Бяляўскі*** (б/п) - 24,53 ***В.Задаля*** (БНФ) - 20,79

Гродзенская Пралетарская акруга N 124(54,3): ***К.Жынь*** (БНФ) - 22,8 ***А.Танкевіч*** (б/п) - 21,6

Гродзенская Прынёманская акруга N 125(53,2): ***М.Маркевіч*** (БНФ) - 24,9 ***В.Жукава*** (ПКБ) - 17,1

Гродзенская СуворАўская акруга N 126(50,2): ***Л.Школьнік*** (б/п) - 20,6 ***І.Нячай*** (ПКБ) - 18,2

Гродзенская сельская акруга N 127(59,3): ***Т.Гавін*** (б/п) - 30,4 ***У.Ражко*** (б/п) - 17,1

Лідзкая Чырвонаармейская акруга N 133(62,8): ***Я.Енка*** - 23,1 ***С.Лазарэвіч*** (БНФ) - 20,0

Лідзкая Камсамольская акруга N 134(58,5): ***П.Ярошка*** (ПКБ) - 27,6 ***С.Суднік*** (БНФ) - 25,5

Слонімская гарадзкая N 140 (69,4): ***М.Дмухоўскі*** (ПКБ) - 23,4 ***А.Якімовіч*** (БНФ) - 18,5

Астрынская акруга (71,6): ***С.Домаш*** (б/п) - 39,9 ***Снапкоў*** (б/п) - 22,2

Такім чынам у другі тур выйшлі 7 прадстаўнікоў БНФ, 5 камуністаў, 1 член АДПБ і дзевяць беспартыйных. Можна сьмела прагназаваць, што ў другім туры выбары напэўна адбудуцца ў Гродзенскай-Болдзінскай акрузе, а таксама ў Слоніме і Астрыне. Лёс кандыдатаў у дэпутаты па іншых акругах будзе залежаць ад таго, наколькі ўлады будуць зацікаўлены ў тым, каб людзі і 10 сьнежня прыйшлі на выбарчыя ўчасткі.

ПРАВАКАЦЫЯ!

Напярэдадні выбараў у Дзяржынскай выбарчай акрузе зьявіліся самаробныя ўлёткі, у якіх на мове - трасянцы заклікалася «Жыды - гэць з Беларусі!», «Далоў іудэонацызм». Камусьці вельмі хацелася, каб улётка выглядала як справа рук БНФ. Ды толькі самыя недасьведчаныя людзі, ці, лепш сказаць, дурні, могуць уявіць сябе, што беларус будзе некага выганяць з сваёй зямлі! Тыя ж габрэі ў сярэднія стагоддзі, калі ў Эўропе палалі вогнішчы інквізіцыі, шукалі паратунку ў беларускіх гарадах і мястэчках і знайшлі яго. Беларусь ніколі не спазнала габрэйскіх пагромаў, якія хвалямі каціліся па Расіі. У гады апошняй вайны беларусы выратавалі тысячы габрэяў, хавалі іх у сваіх хатах. Многім гэта каштавала жыцьця. Пасьля вайны нашыя бацькі і дзяды разам прайшлі праз Гулагі. Дык няўжо пасьля гэтага ў беларуса магла падняцца рука на суседа-габрэя?

Толькі чужынец мог напісаць гэтыя словы. А каму ня месца на нашай зямлі - дык гэта чужынцам.

ГАРАЕЎ ПАЛЯЦІЦЬ З РАБОТЫ?

Як вядома, на прэс-канферэнцыі з журналістамі напярэдадні выбараў прэзідэнт заўважыў, што людзі з прэзідэнцкай адміністрацыі, якія выставілі свае кандыдатуры на гэтыя выбары, паляцяць з работы. Па гарадзенскай Болдзінскай акрузе N 121 балатаваўся і выйшаў у другі тур начальнік Галоўнага ўпраўлення службы кантроля прэзідэнта па Гарадзенскай вобласці Сяргей Гараеў. Зыходзячы з гэтага, можна чакаць, што пасьля выбараў сп. Гараеву прыйдзецца шукаць іншае месца працы.

ВІКТАР ЛЮДВІКОВІЧ

ЧАРГОВАЯ СТАБІЛІЗАЦЫЯ ЦЭНАЎ

У мінулую пятніцу Гарадзенскі аблвыканкам прыняў рашэньне ў сувязі з ростам цэнаў на паліўна-энергетычныя, матэрыяльныя і іншыя рэсурсы, адсутнасьцю сродкаў бюджэту на вяртаньне стратаў ад перавозкі пасажыраў у гродзенскім транспарце павялічыць з сёньняшняга дня кошт праезду ў гарадзкім транспарце. Так, талон на аўтобус і тралейбус каштуе ўжо 800 рублёў (да гэтага 600). Ільготнікі змогуць набыць талоны за палову кошту. Адпаведна падаражэлі і праязныя білеты: на аўтобус ці тралейбус да 32 тысячаў, а агульны - да 40 тысячаў.

Многія жыхары Горадні даведаліся пра павышэньне коштаў ужо ў панядзелак, калі кіроўцы некаторых аўтобусаў і тралейбусаў дабразычліва пачалі пасажырам раіць набываць «апошнія танныя талончыкі». Скарыстаўшы параду, на маіх вачах адна кабета набрала талонаў аж на 60 тысячаў.

На фоне аптымістычных заяваў ураду аб стабілізацыі цэнаў рашэньне нашых уладаў выглядае досыць дзіўным. Ці то «бацька» не дагледзеў, ці то пра стабілізацыю ў Горадні першы раз чуюць.

ВІНЦУК МАЛЬСКІ.

ЗАБУДОЎШЧЫКІ КАТЭДЖАЎ ВЫМУШАНЫ КРАСЬЦІ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ

Ва ўмовах энергетычнага «голаду» у Беларусі ўзьнік новы від правапарушэньняў - скраданьне электраэнергіі. На працягу кастрычніка-лістапада гэтага года супрацоўнікамі энерганагляду і міліцыі праведзены праверкі энергазабесьпячэньня жылых дамоў і катэджаў. Высьвятлілася, што многія ўладальнікі дамоў нелегальна падключаюцца да лініі электраперадач і ня плоцяць за выкарыстаньне электрычнасьці ні рубля. У прыватнасьці было выяўлена 933 факты скраданьня электраэнергіі. Злодзеі скралі 3 мільёна 821 тысячу квт. гадзін электраэнергіі, кошт якой склаў 995,6 мільёна рублёў. Прычым, часьцей і больш за ўсё скрадалі электраэнергію ў Віцебскай вобласьці - 262 факты скраданьня на суму 431,6 мільёна рублёў. Цікава, што многія з парушальнікаў сталі злодзеямі не па ўласнай волі. Справа ў тым, што многія забудоўшчыкі катэджаў згодны былі б законна электрыфікаваць свае дамы і плаціць, але мясцовыя органы ўлады ім адмаўляюць, бо ня маюць патрэбнага абсталяваньня для перадачы электраэнергіі. Таму такія ўладальнікі дамоў, якія падключыліся да электралініяў самастойна, пэўна лічаць, што ім ня трэба плаціць за электраэнергію.

СІМ

«ПРОСИМ ПРОВЕСТИ РАБОТУ»

Вось такую тэлеграму атрымаў калгас імя Леніна Берастаўіцкага раёну ад старшыні выканкаму Берастаўіцкага райсавету.

«Председателю колхоза.

Просим вас провести работу по широкой пропоганде доклада президента РБ на совещании руководящей и исполнительной власти после 20 - 21 11.95 и других документов с населением и общественностью. Информировать об исполнении 30.11.95.

27.11.95 М.М.Захарчук»

ПАГОНЮ хоць ніхто і не прасіў прапагандаваць такую лёсавызначальную падзею ў жыцьці краіны, застацца ў баку мы не змаглі. І таму ўносім свой сьціплы ўклад у справу павышэньня сьвядомасьці беларускага народу. Чытайце другую старонку газеты.

УВАГА!

Паважаныя сябры! Тыя, хто хоча і можа аказаць практычную падтрымку ініцыятыўнай групе кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савету Міколы Маркевіча, просім прыйсьці ў рэдакцыю «Пагоні» 4 сьнежня а 19-ай гадзіне.

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

ИЗ ИНТЭРВЬЮ ПРЕЗИДЕНТА БЕЛОРУСИ А.ЛУКАШЕНКО

корреспонденту немецкой газеты «Хандельсблат» МАРКУСУ ЦИММЕРУ /передано по белорускому радио 23 ноября 1995 г. 19.50/.

Вопрос: *в восточно-европейских странах сейчас ведётся дискуссия по поводу того, какая модель демократии является оптимальной: с сильной президентской властью или сильной парламентской властью. Если я правильно понимаю, вы выступаете за сильную президентскую власть. Как вы считаете, это оптимальная модель для Республики Беларусь?*

А.ЛУКАШЕНКО: Знаете, так нельзя ставить вопрос. Поверьте, история Германии - это слепок истории в какой-то степени Беларуси на определенных этапах. В свое время Германия была поднята из руин благодаря очень жесткой власти. **И не все только было плохое связано в Германии и с известным Адольфом Гитлером.**

Он перечеркнул все хорошее, что он сделал в Германии, всей внешней политикой и развязал Вторую мировую войну. Ну, а все остальное уже вытекало из этого. Это гибель людей массовая, в том числе и немецкого народа. Но вспомните его власть в Германии. Нас с вами тогда не было, но по истории мы это знаем.

Ведь немецкий порядок формировался веками. При Гитлере это формирование достигло наивысшей точки.


Это то, что соответствует нашему пониманию президентской республики и роли в ней президента.

То есть я хочу конкретизировать, чтобы вы не подумали, что я приверженец Гитлера. Нет, я подчеркиваю, что не может быть в каком-то процессе или в каком-то человеке все черное или все белое. Есть и положительное. Гитлер сформировал мощную Германию благодаря сильной президентской власти. Это были 30-е годы, время сильного кризиса в Европе, а Германия поднялась благодаря сильной власти, благодаря тому, что вся нация сумела консолидироваться и объединиться вокруг лидера.

Сегодня мы переживаем такой же период времени, когда нужна консолидация вокруг одного или группы людей, чтобы выжить, выстоять и подняться на ноги. Поэтому на этом этапе определяющее значение, ведущее, я бы сказал, значение будет иметь глава государства - президент, в усилении власти которого нет необходимости сегодня. **У президента достаточно власти.** Поэтому наш этап истории отличается от соответствующего этапа немецкой истории тем, что нам нет необходимости устанавливать абсолютную власть одного человека.

***

Каментарый, здаецца,не патрэбны



ЗДЫМІ МАСКУ, ФАНТАМАС! Г.С.

ПРАФІЛАКТЫКА МАЗГОЎ

Два дні ўладальнікі тэлевізараў марна спрабавалі наладзіць свае антэны на Пецярбургскі канал. Рэч у тым, што па тамтэйшаму ТБ у панядзелак павінна была выйсьці передача з удзелам парламанцкай апазіцыі БНФ. «Вынаходлівыя» беларускія тэлевізіёншчыкі тэрмінова распачалі тэхнічныя прафілактычныя работы. Так галоўныя ідэолагі краіны клапацяцца пра цноту мазгоў нашага электарату. «Дзякаваць» вялікаму аматару рухавых гульняў і «гимнастачак» павінны і заўзятары футболу - за няўбачаную прамую трансляцыю з Токіа фіналу Міжкантынентальнага кубка.

МАРЦІН КАЛАМУТНЫ.

ПРАВАВЫ ЧАРНОБЫЛЬ

Як паведаміў на сваёй прэс-канферэнцыі Мечаслаў Грыб у краіне дэ-факто ўведзена прамое прэзідэнцкае кіраваньне. " У Беларусі не выконваюцца законы, прэзідэнтам ігнаруюца рашэньні суда, у тым ліку і канстытуцыйнага. Я не разумею, што гэта за антынацыянальная: антынародная дыктатура" - заявіў М.Грыб. Сітуацыю з захаваньнем законносьці спікер ахарэктэрызаваў як "прававы Чарнобыль, а можа быць, і горш",

Камянтуючы рашэньні КС аб пераглядзе рашэнняў аб працэнтнай квоце другога тура выбараў, спадар Грыб заявіў: "Канстытуцыйны суд ня мае права адмяняць рашэньня парламанту. Калі ж КС вярнуў старую квоту, то мы здымаем усялякаю адказнасьць за зрыў выбараў".

СІМ

ХЛУСЬНЯ

Пасьля выступу Прэзідэнта на рэспубліканскай нарадзе кіраўнікоў выканаўчай улады ў «ПАГОНЮ» неаднаразова тэлефанавалі ўсхваляваныя й абураныя чытачы: у сваім выступе Лукашэнка ўзгадвае і «ПАГОНЮ», адзываючыся аб ёй мякка кажучы «нелестно». Але ў друку ў тэксьце выступу назва «ПАГОНІ» ўвогуле ня ўзгадвалася! Што ж, карэктавалі ў свой час словы Брэжнева, карэктуюць і Лукашэнку. Але ці можна адкарэктаваць хлусьню, якая выпадкам ліецца з вуснаў першай асобы краіны? Не! Як бы не стараліся гэта зрабіць «замяталінскія карэктары». Хлусьню можна толькі выкрыць! Прапануемы вашай увазе кавалак выступу прэзідэнта - узор непрыхаванай ілжы і цынізму, якія маюць на мэце перакласьці адказнасьць за тое, што дзеецца ў краіне з хворай галавы на здаровую.

Я скажу больш. Сёньня радыкал-нацыяналістычная апазіцыя пры падтрымцы ценявых мафіёзных структур у поўным сэнсе слова імкнецца да ўлады, да бязьмежнай дыктатуры. Ускормленыя на «брудныя» грошы палітыкі і сродкі масавай інфармацыі нагнятаюць у грамадстве масавы псіхоз, нацкоўваюць насельніцтва на дзяржаўныя структуры, на Прэзідэнта.

Усе іх разважаньні аб свабодзе друку, вяршэнстве закона - ня больш чым прапагандысцкае прыкрыцьцё адкрытай прагі рэваншу за зьнішчальнае паражэньне, якое пацярпела апазіцыя на прэзідэнцкіх выбарах, на першым этапе выбараў у парламант і ў ходзе рэферэндуму. Вельмі шкада, але і на другім флангу ім пачынаюць падпяваць учарашнія непрымірымыя. Усе яны аб'ядналіся ў барацьбе супраць Прэзідэнта. Ну што ж! Справа Ваша...

Паглядзіце, як ліхаманкава праводзяць яны свае зьезды, кангрэсы, сімпозіумы, «круглыя сталы», раздаюць адзін аднаму доларавыя «кармавыя». На гэтых сходах, фінансуемых з добра вядомых крыніц, ужо адкрыта гучаць заклікі выводзіць народ на вуліцы.

Таварышы кіраўнікі! Не жывіце ілюзіямі. Калі нацыяналістычная суполка «спадароў» установіць сваю дыктатуру, для многіх з Вас і Вашых сем'яў адразу ж паўстане пытаньне аб асабістай бясьпецы. Галоўная ж задача нацыяналістычнай дыктатуры - усталяваць уладу крымінальнага капіталу і крымінальнай мафіі, каб канчаткова разрабаваць і вывезьці ў чужыя банкі народны набытак. Нездарма для іх ідэалам зьяўляецца недалёкая прыморская дзяржава, дзе трэць валавога нацыянальнага прадукту забясьпечваецца за кошт кантрабанды зброі і наркотыкаў, яшчэ адна трэць - за кошт кантрабанды каляровых металаў і толькі трэць - за кошт уласнай вытворчасьці. А што датычыць палітычнай сітуацыі, то амаль палова насельніцтва гэтага вельмі невялікага па тэрыторыі прыморскага «раю» поўнасьцю пазбаўлена элементарных палітычных, сацыяльных і эканамічных правоў, аб парушэньні якіх была афіцыйная заява ААН.

У мяне моцныя нервы. Ня выйдзе, панове! У полымі агрэсіўнай балбатні і абяцаньняў, якое вы разьдзімаеце, зграць, перш за ўсё, вашы амбіцыі і дамаганьні на антынацыянальную і антынародную дыктатуру. Але і вы, кіраўнікі выканаўчай улады на месцах, не павінны сядзець склаўшы рукі. Вы абавязаны, абапіраючыся на канстытуцыйныя нормы, у кожнай вобласьці, у кожным раёне пакласьці канец разгулу экстрэмісцкіх і мафіёзных элементаў, пад якімі б перавернутымі лозунгамі яны ні выступалі. І гэта - ваш прамы абавязак перад народам.

ЯК ПАСВАРЫЛІСЯ ДЭМАКРАТ ІВАНАВІЧ З ДЭМАКРАТАМ НІЧЫПАРАВІЧАМ

Што за палітык Дэмакрат Іванавіч! Роўных яму няма на ўсёй Беларусі. А як шыкоўна ён выглядае на трыбуне Вярхоўнага Савету! Цыцэрон, ды годзе! А ўжо калі пачне разважаць аб дэмакратыі - як салавей пяе. Не, калі гэткіх палітыкаў нараджае зямелька наша - ня згіне сьвятая дэмакратыя.

А што за чалавек Дэмакрат Нічыпаравіч! Які мяккі, рахманы, лагодны. Але за родную дэмакратыю ён гарою стаіць, супраць усялякага дэспатызму і таталітарызму. А калі ўбачыш яго на мітынгу - уначы не засьнеш, асабліва калі ты дзяўчына - прыхільніца дэмакратыі. Увесь час будуць мроіцца яго рэдкія кудры, яго позірк праз таўсьценныя акуляры.

А як паважаюць гэтыя Дэмакраты з вялікай літары адзін аднаго! Інакш, чым «шаноўны», «паважаны», «глыбокапаважаны», «мой таленавіты калега» не называюць. Бо абодва яны дзеці адной маці - славутай Дэмакратыі.

А ці чулі Вы, што адбылося паміж імі гэтай восеньню?

Прыйшоў час складаць спіс кандыдатаў у дэпутаты. Сустрэліся Дэмакрат Іванавіч з Дэмакратам Нічыпаравічам і пайшлі разважаць.

- На першае месца,- кажа дэмакрат Іванавіч,- паставім сваіх, а потым - што застанецца - і вашых.

- Прабачце,- кажа Дэмакрат Нічыпаравіч,- як гэта - што застанецца? А хіба гэта не мы ў свой час амаль што ўзялі ўладу ў рэспубліцы? Толькі сотні тры галасоў у Вярхоўным Савеце не хапіла.

- Не,- адмовіўся Дэмакрат Іванавіч,- гэта наш кандыдат на выбарах прэзідэнта заняў ганаровае трэцяе месца ззаду. А ваш і наогул не трапіў у спіс.

- А ня трапіў,- кажа Дэмакрат Нічыпаравіч,- бо вы разам з камуністамі нас не падтрымалі. І наогул, што вы рабілі да 1986 года?

А Дэмакрат Іванавіч на гэта кажа:

- А вы, Дэмакрат Нічыпаравіч, самы сапраўдны папуліст!

Калі б не казаў гэта Дэмакрат Іванавіч, можа ўсё б абыйшлося. Але гэта якая ж пагарда - на ўсю перадвыбарную кампанію!

І вось зараз усе судзейскія, і чыноўныя, і нават некаторыя, што раней сябравалі з абоімі Дэмакратамі ад рогату трымаюцца за жываты. А між імі бойка ідзе не на жывот , а на сьмерць. І ўсе свае дэмакратычныя набыткі яны дзеляць як муж з жонкай, калі разыходзяцца. Кажуць, што сам прэзідэнт амаль што паўгадзіны рагатаў, калі пачуў пра гэта.

А што рабіць нам, дэмакратам з малой літары?

МІКАЛАЙ ГОГАЛЬ

КАРУПЦЫЯ, ЯК ПУНКТ АПОРЫ СІСТЭМЫ КІРАВАНЬНЯ

«Дайце мне пункт апоры, і я перавярну ўвесь сьвет», - казаў вялікі Архімед. «Дайце мне дасье на кожнага, і я змагу кіраваць усім сьветам», - кажа прэзідэнт Лукашэнка, а калі ня кажа, то думае, калі ж ня думае, то так кажуць, думаюць і дзейнічаюць ягоныя набліжаныя і давераныя. Такую выснову можна было зрабіць, назіраючы за падрыхтоўкай і ходам шматлікіх сустрэч прэзідэнта з кіраўнікамі розных рангаў і розных арганізацый.

Так, перад сустрэчай з кіраўніцтвам афіцыйных прафсаюзаў дыктар тэлебачаньня бадзёра заявіла, што на гэтай сустрэчы ў прэзідэнта цяжкасьцяў ня будзе, бо ў яго, маўляў, на кожнага шмат чаго ёсьць. Трэба меркаваць, кампрамату. Прыкіньце, як павінен весьці сябе чалавек, якому перад сустрэчай з Прэзідэнтам паказалі ўласнае дасье. Павінен сядзець, маўчаць, ківаць галавой і з усім згаджацца, калі ня хоча, каб справе далі ход. «Лухта, - скажаце вы. - Калі чалавек сумленны, дык чаго яму баяцца?» Дык то ж калі сумленны, але дзе вы тых сумленных возьмеце? Хто сёньня займае ўсе кіраўнічыя пасады, хто ў вертыкалі, у прафкамах, заўкамах, хто нам «мама» і «тата»? Мо людзі з нізоў, мо дэмакраты? Не і яшчэ раз не!

Каля кнопак і кнопачак, каля рычагоў і рычажкоў машыны ўлады стаяць, сядзяць, ляжаць былыя: былыя начальнікі, сакратары, інструктары, інсьпектары, адным словам - былыя члены авангарду савецкага народу, розуму, гонару і сумленьня вялікай і магутнай КПСС, былыя камуністы і камуніс'цкі. А дзе вы бачылі сумленнага камуніста? Такіх не было, няма і быць ня можа. Таму, што ня можа быць ніколі. Уся камуністычная ідэалогія заснаваная на гвалце. Адабраць і падзяліць - вось асноўныя прынцыпы камунізму. І калі ў тэорыі меркавалася дзяліць пораўну, хоць і не канкрэтызавалася паміж кім, то на практыцы дзялілі далёка ня так.

Асабліва забыўчымі на роўнасьць сталі таварышы ў апошнія гады. Пакідаючы тонучую баржу КПСС, верныя ленінцы імкнуліся прыхапіць як мага болей, і ня толькі з маёмасьці партыі. Гэта яны, апанаваўшы ўсе суполкі ўлады, разьвілі інфляцыйныя працэсы, абабралі народ і стварылі першапачатковы капітал, хто ў выглядзе крамы, хто катэджа, хто валютнага рахунку. Гэта яны правялі «прыхватызацыю» і нахапалі, колькі маглі. І таму менавіта на іх наш галоўны антыкарупцыянер мае шмат кампрамату. Ён, безумоўна, хацеў бы мець кампрамат і на Пазьняка, але той нават цьвікоў ня краў. Няма кампрамату і на іншых кіраўнікоў Беларускага Народнага Фронту. Затое ёсьць на кіраўнікоў астатніх партый і рухаў. І вось зараз давайце ўявім той «круглы стол», гавэнды пра які ўжо набілі аскому. Сядаюць за стол кіраўнікі партый і рухаў, і кожны ведае, скажаш ня ў масьць, і пачынай варушыць мазгамі, як выкруціцца ці са скандалу, ці з крыміналу. Таму будзе той стол хутчэй падобны на раяль з адным клавішам, дзе кожная струна будзе гучаць па-свойму, але аднолькава прыемна для прэзідэнта.

Добра спрыяе такое кіраваньне і таму, каб трымаць на кароткім павадку дырэктараў прадпрыемстваў, банкаў, старшыняў калгасаў і г.д. У гэтай кагорце сьвятых таксама няма. За кожным нешта ёсьць. Ледзь высунуўся ня ў такт, а тут ужо і прэзідэнцкая камісія, якая дакладна ведае, дзе і што шукаць Асабліва лёгка прыблытаць любога дырэктара па артыкулу «Неатрыманы прыбытак». Тут і Форд не адкруціўся б.

Не, дарэмна вы, спадары дэмакраты, крытыкуеце прэзідэнта за непамернае раздуваньне штатаў Міністэрства ўнутраных справаў. Вы проста ня ведаеце, колькі ў іх працы. Гэта ж трэба сабраць матэрыялы на кожнага: ад дзядзі Васі-конюха да міністра, каб забясьпечыць бесперабойнае функцыянаваньне машыны ўлады, бо ў наш час усе сталі такімі языкатымі, што пакуль якому-небудзь не засьвеціць гады тры месцаў ня надта далёкіх, - ня змоўкне. А каб засьвяціла, трэба вой як працаваць.

Што ж, вяршыня ўлады сьлізкая. Кожны шукае свой пункт апоры. Хто абапіраецца на любоў і давер народу, хто на сілу і гвалт, а хто на карупцыю. І невядома, чый пункт апоры трывалейшы. Ва ўсякім разе Лукашэнку пакуль нічога не пагражае, бо беларусы красьці не перасталі і ў бліжэйшы час наўрад ці перастануць, асабліва тыя, хто пры ўладзе.

Язэп АБУХОВІЧ.

НАРОДНАЕ - НЯ РОДНАЕ?

24 лістапада ля ўваходу на фабрыку мастацкіх вырабаў «Сузор'е» было даволі тлумна. Работніцы фабрыкі імкнуліся патрапіць на тэрыторыю роднага прадпрыемства. На мэце стаяла правядзеньне агульнага сходу з жаданьнем выказваньня недаверу цяперашняму кіраўніцтву «Сузор'я».



Уваходныя дзьверы, аднак, так і не расчыніліся - адміністрацыя фабрыкі на чале з дырэктарам Міхаілам Балоціным проста праігнаравала памкненьне сваіх падначаленых. Натоўп жанчынаў скіраваўся ў бок суседняй школы N 1, дзе абураныя працаўніцы знайшлі прытулак у актавай залі. Натуральна, што першасным паўстала пытаньне пра кворум працоўнага сходу і адпаведна правамоцнасьць ягоных выракаваньняў. Прысутная загадчыца аддзела кадраў ня здолела (ці не захацела?!) прывесьці дакладную колькасьць людзей у працоўным штаце, назваўшы спачатку лічбу 417, пасьля 371. Тэрміновы падлік выявіў наяўнасьць у залі толькі паўтары сотні людзей. Стала зразумелым, што ўсе рашэньні сходу могуць насіць характар толькі своеасаблівага «мяккага рэйтынгавага галасаваньня». У цэнтры абмеркаваньня стаяла асоба сп.Балоціна - дырэктара фабрыкі. Выступоўцы скардзіліся на невыносныя ўмовы працы (у пашывачным цэху - 7° С, у эксплуатацыйным - каля 2 градусаў), на пастаянную затрымку заробкай платы. Дырэктара (які, нягледзячы на асабістае запрашэньне, так і не зьявіўся на вочы працаўнікоў) вінавацілі ў стварэньні становішча, калі людзі змушаны звальняцца, ісьці ў адпачынак за свой кошт (афармляецца гэта часьцяком ранейшымі датамі).

Яшчэ пару гадоў таму на фабрыцы працавала каля 1400 чалавек, зараз іх колькасьць скарацілася ў чатыры разы. За мяжой купляліся дарагія кампутары, абсталяваньне, якія амаль не задзейнічаны, тым часам прадпрыемства страціла ўнікальных сьпецыялістаў. Падкрэсьлівалася, што калі "Сузор'е " працавала на арэндзе, усе былі задаволены. Пасьля прыватызацыі фабрыкі распачаліся адмоўныя тэндэнцыі. Многія акцыянеры засталіся «з носам», іншыя ўжо ні на што ня маюць спадзяваньняў.

Адна з галоўных бедаў працаўнікоў нашых прадпрыемстваў -элементарная юрыдычная недасьведчанасьць, няведаньне сваіх правоў і паўнамоцтваў. Яны самі сябе заганяюць у пастку - выйсьця з якой часьцяком няма. Некаторыя гэта пачынаюць разумець - чатыры чалавекі на фабрыцы мастацкіх вырабаў ужо ўступілі ў незалежны прафсаюз.

Застаецца дадаць, што на сходзе прысутнічалі адказныя ўладныя асобы на чале з Валянцінай Лаўцэль - намесьніцай старшыні гарвыканкаму па эканоміцы. Яны кваліфікавана адказалі на зададзеныя пытаньні.

Учора меўся адбыцца паўторны сход працоўнага калектыву фабрыкі. Пра яго вынікі мы паведамім у бліжэйшым нумары.

Хельмут Каменскі.
Нават фабрычным сабакам млосна
Фота А.Уладасевіча

КРАІНА ШТУЧНЫХ ДЭФІЦЫТАЎ

У адным з восеньскіх нумароў «ПАГОНІ» паведамлялася, што на заводзе карданных валоў спынена вытворчасьць аўтамабіляў для інвалідаў. Міністэрства сацыяльнага забесьпячэньня Беларусі вырашыла, што выгодней атрымоўваць гэтыя машыны з Украіны. Між тым, толькі ў Горадні на чарзе стаіць 70 інвалідаў вайны і 460 інвалідаў іншых катэгорый.

Нядаўна для таго, каб выдзеліць аднаму з іх дэфіцытны транспартны сродак, спатрэбілася нават сьпецыяльнае рашэньне аблвыканкаму. Трэба чакаць, што ў хуткім часе выканаўчую ўладу літаральна засыплюць заявамі іншыя інваліды. У краіне штучна створаных дэфіцытаў людзям дапамагаюць толькі тады, калі яны паабіваюць ногі аб «высокія парогі» і зразумеюць сваю мізэрнасьць перад тварам улады.

«НАКРУТКА» НА ГАРЭЛКУ - 150 ПРАЦЭНТАЎ

Тыдзень таму гарадзенскі аблвыканкам устанавіў для прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня ўсіх формаў уласнасьці крайнюю мяжу на віна-гарэлачныя вырабы. Прадпрыемствы I і II катэгорый атрымалі права фармаваць «эканамічна абгрунтаваныя» нацэнкі, зыходзячы з фактычных выдаткаў абароту, усіх відаў падаткаў, попыту і г.д., але "накрутка" не павінна перавышаць устаноўленую мяжу.

Так, максімальная мяжа нацэнак на разьліўное піва на прадпрыемствах вышэйшай і першай катэгорыі не павінна перавышаць 60 працэнтаў; на віна-гарэлачныя вырабы на ўсіх прадпрыемствах мяжа ўстаноўлена ў 150 працэнтаў. Гэта азначае, што максімальны кошт гарэлкі ў рэстаранах ня будзе перавышаць 65 тысячаў рублёў за паўлітровую пляшку. Для багатых ня так і шмат, а бяднейшыя як хадзілі са сваёй гарэлкай у рэстарацыі, так і хадзіць будуць.

НА «УСУШЦЫ» I «УТРУСЦЫ» - ПАЛОВА ПРАДУКЦЫІ

Больш паловы выраблена у горадзе прадукцыі сёньня залежваецца на складах. У прамысловасьці Горадні запасы ад месячнай вытворчасьці складаюць 39 працэнтаў. Найбольш перагружаныя склады прадзільна-ніткавага аб'яднаньня - 155 працэнтаў (!), гарбарнага завода - 111 працэнтаў, вытворчага аб'яднаньня «ХВАЛЯ» - 91 працэнт, і пальчаткавай фірмы «АКЦЭНТ» - 78 працэнтаў. Дзейсным сродкам разгрузкі складоў было б зьніжэньне коштаў прадукцыі, але гэта адаб'ецца на заробнай плаце. Калі на гарбарным заводзе яе сярэдні памер складае 1624 тысяч і страта, дапрыкладу, сотні тысячаў, істотна кішэню не спустошыць, то для рабочых «АКЦЭНТА», якія зарабляюць у сярэднім 409 тысячаў, тая ж сотня - грошы значныя.

В.ДРЭМА.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ФЕАДАЛІЗМ

Памятаеце, як у савецкіх падручніках па гісторыі пісалі пра панскі прыгнёт над сялянамі ды рабочымі. Гнулі і гнулі сьпіну бедныя людзі на гаспадароў за капейку, аж пакуль з дапамогай бальшавікоў ня сталі сьвядомымі ды ня скінулі эксплуататараў.

Сёньня людзі па-ранейшаму гнуць сьпіну. Толькі ня ведаюць - на каго і за што. Некалькі месяцаў ужо не атрымліваюць заробку, і невядома з каго патрабаваць.

Так, з ліпеня не атрымоўвалі грошай на тонкасуконным аб'яднаньні і заводзе зборнага жалезабетону. З жніўня - на металаапрацоўчым заводзе і аб'яднаньні надомнай працы. З верасьня - на аб'яднаньні «Гроднадрэў». Пры гэтым з усіх трыбунаў людзей навучаюць - сядзі ў будзе і чакай, што будзе. Сьвядомыя людзі больш нікому не патрэбны ...

Р. ВЕРАС.

АМЕРЫКАНЕЦ У ІВЕЙСКІХ ФЕРМЕРАЎ

Зараз кожная пятая фермерская гаспадарка Гарадзенскай вобласьці знаходзіцца ў Івейскім раёне. Іх тут каля 60 і валодаюць усе разам 470 гектарамі зямлі.

Пра нялёгкае жыцьцё фермераў і надзённыя праблемы гаварылася тыдзень таму на раённай канферэнцыі сяброў асацыяцыі сялянскіх і фермерскіх гаспадарак Івейшчыны. Акрамя суседзкай парады і добразычлівых пажаданьняў удзельнікі канферэнцыі змаглі атрымаць адказы на пытаньні ад прадстаўніка Саюзу фермераў краіны Уладзіміра Шчукіна і ад дырэктара па сувязях з грамадзкасьцю Саюзу фермераў штата Паўднёвая Дакота Чарльза Гроса са Злучаных Штатаў.

Ашчасьлівілі канферэнцыю сваёй прысутнасьцю і мясцовыя начальнікі.

ЗЬМІЦЕР СЬВІСТУНОВІЧ.

ДАХЛАВАТЫЯ КУРАНЯТЫ

Папярэднія вынікі 1995-га сельскагаспадарчага года.

(з выступу міністра сельскай гаспадаркі ценявога кабінета БНФ «Адраджэньне» акадэміка Івана Нікітчанкі)

Калгасы і саўгасы забясьпечаць сёлета патрэбы насельніцтва ў мясе на 60%: дадуць кожныя 40 кг з неабходных 72 кг; у малацэ на 70%: дадуць 270 кг з 420 кг; у збожжы на 72%. Гародніны ў магазінах практычна ня будзе. Страты ў выніку безгаспадарчасьці і крадзяжу сёлета склалі адну трэць ад таго, што было за папярэднія чатыры гады. Гэтыя страты ў грашовым эквіваленьце раўняюцца ўсёй вытворчасьці жывёлагадоўлі Гарадзенскай вобласьці за год.

Прадукты ў магазінах прадаюцца па цэнах у пяць разоў большых, чым тыя, па якіх яны закупляюцца ў вытворцаў. Малако закупляецца ў калгасах і саўгасах па 1200 рублёў за кілаграм. Малочная прадукцыя ў магазінах па 600 рублёў. Жыта закупляецца па 750 рублёў за кілаграм. З кілаграма атрымоўваецца 1,4 кілаграма хлеба па цане ўжо больш 2000 за булку ў 800 грамаў. Мяса закупляецца па 7-11 тысяч рублёў. У магазіне самае таннае - па 23000, а каўбасы ўжо сягаюць да 70000 за кілаграм.

Ва ўсіх нашых суседзяў ад Латвіі да Польшчы прадукты ў два разы таньнейшыя, чым у нас. Але калі прывезьці іх да нас, то цана ўзрастае ў 2,3 разы за кошт 15% мытных збораў і 10-15% падатку на дабаўлены кошт, плюс усе астатнія падаткі. Такім чынам цэны на імпартныя прадукты становяцца большыя, чым на свае, але сваіх не хапае. Таму цэны на прадукты айчыннай вытворчасьці падымуцца да імпартных.

Прэзідэнт «падкарэктаваў» бюджэт. Зараз 23,2% даходнай часткі фармуюцца за кошт розных填 пабораў з насельніцтва, акрамя падаткаў. 27% расходнай часткі прызначана для крадзяжу. Залатая жыла для злодзеяў - Чарнобыльская праграма. Толькі на дэзактывацыю выдзелена 2,4 трыльёна рублёў. Але ў сьвеце не існуе тэхналогіі такой масавай дэзактывацыі. Таму гэтыя грошы зьнікнуць, як і зьнікалі дагэтуль.

Канстытуцыйны Суд прызнаў незаконнымі папраўкі Прэзідэнта да бюджэту, але грошы ўжо ня вернеш. Хіба толькі праз суд. Але ў нашай краіне такога суда ня знойдзеш.

КАЛІ БОГ НА ДРУГІМ ПЛАНЕ

Пра пазіцыі кіраўніцтва Рускай праваслаўнай царквы на Беларусі адносна Беларускага Народнага Фронту ілюзій ніколі не ўзьнікала. Укамплектаваная выключна выхадцамі з Расеі яна стаіць на больш цьвёрдых імперскіх пазіцыях, чым нават Жырыноўскі са сваімі ліберал-фашыстамі. Калі Філарэт ці яго епіскапы кажуць пра адзінства і веру, то трэба разумець адзінства ў складзе Расеі і веру расейскую. У гэтым рэчышчы ідзе выхаваньне і ў духоўных семінарыях, у тым ліку і ў славутай Жыровіцкай пад Слонімам, рэктарам якой зьяўляецца япіскап Канстанцін.

Два тыдні таму Канстанцін наведаў Ліду. Паездка насіла не шараговы характар. Людзі кажуць, што адных толькі грошай на яго прыём настаяцель Сьвята-Георгіеўскай царквы айцец Алексій патраціў тры мільёны. Ці дакладна гэта ці не, але ўжо 26 лістапада айцец Алексій падчас службы выступіў з рэзкімі нападкамі на Лідзкую арганізацыю Беларускага Народнага Фронту. Каля 20 хвілін «сьвяты» айцец абліваў брудам БНФ і асабліва старшыню Лідзкай Рады Станіслава СУДНІКА, заклікаючы прыхаджан галасаваць на выбарах лепш за банкіраў і камуністаў, але ні ў якім разе не за СУДНІКА.

Чым жа не дагадзіў Станіслаў СУДНІК Канстанціну і Алексію, што яны адважыліся парушыць усе законы і наўпрост з царкоўнага амбона кінуцца ў палітыку, каб дапамагчы «вертыкалі» і камуністам перамагчы БНФ. Аказваецца віна лідара Лідзкай Рады Фронту ні менш - ні больш, як у «расколе праваслаўя».

Алексій абвінаваціў Фронт у падтрымцы «мяцежнай» парафіі Сьвятога вялікамучаніка і цаліцеля Панцелеймона і яе настаяцеля айца Васіля, які хоча толькі аднаго - служыць Богу, ацаляць душы людзкія і будаваць царкву і ня хоча адрачыся ад людзей і кінуць іх без пастыра на волю лёсу і чыноўнікаў ад Канстанціна. На самой жа справе Фронт - гэта арганізацыя палітычная, царква і касьцёл павінны быць па-за палітыкай. Сьферы дзейнасьці Фронту і царквы ніяк не павінны перасякацца, акрамя хіба як у абароне агульначалавечых каштоўнасьцяў і правоў. Фронт падтрымліваў і будзе падтрымліваць права кожнага чалавека маліцца ў той царкве, у якой хоча і славядзіць таму сьвятару, якому хоча. Гэта агульначалавечыя правы, і ніякі Канстанцін адмяніць іх ня можа, што і пацьвярджаюць вернікі.

Сёньня на службе ў Сьвятапанцеляймонаўскай царкве прыхаджан у 3-4 разы болей, чым у Сьвятагеоргіеўскай. Людзі мінаюць царкву, у якой іх вучаць за каго галасаваць, а за каго не, і ідуць туды, дзе ім дапамагаюць адкрыць душу перад Усявышнім, атрымаць суцяшэньне ў наш нялёгкі час, пазбавіцца сумненьняў і набрацца духоўнай моцы.

Расьце царква Сьвятога вялікамучаніка і цаліцеля Панцеляймона ў Лідзе. Заканчваюць аздабленьне ніжняга храма. Да каляд адбудзецца яго асьвячэньне. Разам з царквой расьце ў людзкіх душах вера ў Бога і заўтрашні дзень. І самі людзі растуць духоўна. Дык як можна назваць тых, хто замінае гэтаму росту, хто брудам, паклёпам, хлусьнёю залівае і так такую нялёгкую дарогу да Бога? Калі каму цяжка адказаць, падыйдзіце да могілак у Лідзе на вуліцы Савецкай, што каля «Лідсельмаша». Так выглядалі могілкі ў Берасьцейскай вобласьці пасьля шабашоў сатаністаў. У Лідзе сатаністаў няма. Ёсьць іншыя.

Кастусь АЛЬГЯРДОВІЧ.



СЕМІНАР У ГОРАДЗЕ КАПЕРНІКА



OLSZTYN - Ratusz

З 20 па 25 лістапада ў Ольштыне праходзіў семінар «Функцыянаваньне мясцовага самакіраваньня ў Польшчы». Па запрашэньню арганізатараў (Ольштынскага Цэнтру разьвіцьця мясцовай дэмакратыі і Фонду Стэфана Баторыя) у яго працы прыняла ўдзел дэлегацыя з Гарадзеншчыны, арганізаваная філіяй Фонду імя Льва Сапегі. У склад нашай дэлегацыі ўваходзіла 12 чалавек. Сярод іх - кіраўнік філіі сп. Тацьцяна Маліноўская, дэпутат Вярхоўнага Савету сп. Мікола Аксаміт, старшыня Ваўкавыскага гарсавету сп. Мікола Кавальчук, намесьнік дырэктара інстытута біяхіміі сп. Андрэй Майсяёнак, кандыдат гістарычных навук сп. Алесь Краўцэвіч ды іншыя.

У першы дзень працы семінару яго ўдзельнікі мелі магчымасьці пазнаёміцца з горадам, які мае надзвычай цікавую й багатую гісторыю. Упершыню ён узгадваецца ў 1353 годзе ў прывілеі вармінскай капітулы. Яе адміністратарам у 1516-19 і 1520-21 гадах быў Мікалай Капернік, рукамі якога выкананая астранамічная табліца, фрагмент якой да нашых дзён захаваўся ў старажытным крыжацкім замку. Непадалёк ад Ольштына знаходзіцца Грунвальд. У 1772 годзе ў выніку I падзелу Рэчы Паспалітай Аленштайн (гэтая назва існавала да 1945 года) адыйшоў да Прусіі. Пасьля I сусьветнай вайны на Варміі і Мазурах (рэгіёне, цэнтрам якога зьяўляецца Ольштын) быў праведзены плебісцыт, на якім большасьць насельніцтва выказалася за тое, каб застацца ў складзе Германіі. Пад час II сусьветнай вайны савецкія войскі амаль цалкам зьнішчылі нямецкі горад. Сеньня ў Ольштыне амаль немагчыма спаткаць людзей, якія жылі тут да вайны. Асноўная частка насельніцтва прыехала на гэтыя ўрадлівыя землі пасьля вайны з іншых куткоў Польшчы, а таксама Летувы, Заходняй Украіны і заходняй Беларусі. Сеньня ў ваяводзтве жыве каля 60 тысячаў украінцаў, 40 тысячаў немцаў, 2-3 тысячаў беларусаў. Дарэчы, некаторыя выкладчыкі, якія праводзілі на семінары заняткі, мелі таксама беларускія карэньні.



Праграма семінару была надзвычай насычанай. Удзельнікі гарадзенскай дэлегацыі даведаліся пра задачы і кампетэнцыю ворганаў самакіраваньня ў Польшчы, іх фунцыянаваньне, пра абавязкі дэпутатаў, пра тое, з чаго складаецца камунальная маёмасьць, бюджэт гміны. Надзвычай цікава праходзілі практычныя заняткі па інфармацыйнай палітыцы ворганаў самакіраваньня, якія праводзіла сп.Анна Мрувчыньска.

Вельмі карысным для ўдзельнікаў семінару былі заняткі на тэму стратэгічнага планаваньня, якія праводзіў адзін з лепшых польскіх сьпецыялістаў, дырэктар польскага агенцтва падтрымкі турызму ў Ольштыне сп. Багдан Камінські.

У праграме семінару было запланавана і знаёмства з дзейнасьцю Ольштынскага цэнтру разьвіцьця мясцовай дэмакратыі, які за некалькі гадоў існаваньня правеў аграмадную працу па падрыхтоўцы сьпецыялістаў для ворганаў мясцовага самакіраваньня, па павышэньню камунікацыйнай сувязі і г.д. Сеньня гэтая грамадзкая арганізацыя карыстаецца ў горадзе вялізным аўтарытэтам і вельмі важна таму для ўдзельнікаў семінару было пазнаёміцца з яе багатым досьведам працы.

Ня выключана, што вясной наступнага года ў Горадню прыедзе з адказным візітам дэлегацыя з Ольштына.

ВІТАЎТ РУДНІК.

ПОЛЬШЧА

У нядзелю, 26 лістапада, ва ўсіх касьцёлах і каля іх быў арганізаваны збор сродкаў для дапамогі палякам за ўсходняй мяжой. Гэтая акцыя была зьдзейснена каталіцкай арганізацыяй «КАРЫТАС» пры садзейнічаньні II канала TV, пад патранатам кардынала Юзэфа Глемпа. Сродкі будуць выкарыстаны для дапамогі грамадзянам, для асьветы, катэхізацыі, рэстаўрацыі сакральных аб'ектаў. Дапамога будзе накіравана ў першую чаргу ў Беларусь, Украіну, Расею і Казахстан, дзе, як лічаць, жыве каля 1 млн.200 тысяч палякаў.

***


У кляштары на Яснай Гужэ сустракалі прэзідэнта Леха Валэнсу, шахцёраў, актывістаў «Салідарнасьці». Пры сустрэчы ігумен айцоў паўлінаў Шчэпан Кросьнік сказаў, што брама кляштару заўсёды адчынена для паважанага прэзідэнта, які нароўні з папам Янам Паўлам II зьяўляецца найвялікшым палякам усіх часоў, а таксама для ўсіх, хто кіруецца каталіцкай маральлю. У той жа час гэтая брама зачынена для атэістаў, прыхільнікаў абарцыі, ворагаў хрысьціянскіх каштоўнасьцей і ўсіх з-пад знаку «сярпа і молата».

Ю.Г.

«ГРАБІНА» АНДРЭЯ ГАЎРЫЛЮКА

Пра гэтага сьціплага, але надзвычай цікавага чалавека на Беларусі ведаюць адзінкі. Дый то завочна, дзякуючы беластоцкай «НІВЕ», на старонках якой можна сустрэць яго прозьвішча. Андрэй Гаўрылюк нарадзіўся ў Бельску-Падляскім у беларускай сям'і. Там жа скончыў школу. Па адукацыі - эканаміст. З 1986 года супрацоўнічае з «НІВАЙ», зьяўляецца яе карэспандэнтам. Сем гадоў таму, ажаніўшыся, пераехаў у Ольштын, дзе ўзначальвае зараз тэрытарыяльную раду Беларускага Дэмакратычнага Аб'яднаньня.

Да канца гэтага года ў Ольштыне павінен убачыць сьвет VI сшытак матэрыялаў, сабраных сп.Гаўрылюком. На працягу апошніх гадоў ён зьбірае ўсю інфармацыю, якая зьяўляецца на старонках польскага друку пра Беларусь і пра беларусаў у Польшчы, а таксама іншыя матэрыялы, зьвязаныя з гэтай тэматыкай. Прыкра, што яго плённая праца не знайшла пакуль належнай ацэнкі на Беларусі. Спадзяемся, што частку матэрыялаў сшыткаў мы зможам апублікаваць у «ПАГОНІ».



А яшчэ Андрэй Гаўрылюк выдае газэту «ГРАБІНА», пра якую ў Беларусі амаль ніхто ня ведае. Сьціплая, невялікая па фармату «ГРАБІНА» прываблівае выключнай графікай інжынера Барыслава Рудкоўскага, прастатой і шчырасьцю нататак самаго рэдактара, разнастайным сьпектарам думак пра Беларусь і беларусаў, праблемы нацыянальных меньшасьцяў у Польшчы. Пра сябе і пра сваю газету распавядае сам сп.Гаўрылюк.

- Нарадзіўся я ў Бельску-Падляскім у беларускай сям'і. Там, у Бельску, яшчэ ў часы камуны мы з Барыславам Рудкоўскім спрабавалі зрабіць нешта накшталт газеты, але часы былі неспрыяльныя. З 1986 года я пачаў супрацоўнічаць з беластоцкай «НІВАЙ». Зараз зьяўляюся яе карэспандэнтам.

Пераехаўшы ў Ольштын, адразу навязаў сувязі з беларускім студэнцкім рухам, які ўзначальваў у Ольштыне Уладзімір Пац. З цягам часу пачаў выпускаць і «МАЮ ГРАБІНУ» (так газэта называлася напачатку). Чаму «ГРАБІНА»? - Так называлася ўрочышча каля Бельска і Відава. Жыў калісьці там пан Грабіньскі. Па ваколіцах тых мясцін блукала тады дама ў белым, прывід якой часта палохаў нас, падлеткаў. Захаваліся там да гэтага часу чатыры 700-гадовыя дубы, якія надаюць мясьцінам надзвычайную адметнасьць і прыгажосьць. Так што для мяне мая «ГРАБІНА» атаесамляецца з маёй Айчынай...

Сапраўды, калі Радзіма - гэта ня нешта абстрактнае, а канкрэтны куток роднага краю, дарагія сэрцу ўспаміны дзіцячых гадоў, то вырачыся яе немагчыма, таксама як і бацькоўскай мовы. Шкада, што тым, хто выхаваны на словах песьні: «Мой адрес - не дом и не улица. Мой адрес - Советский Союз!» - гэтага не зразумець.

В.Руднік.

БЕЛАРУСЫ ЗНОЎ АТРЫМАЮЦЬ ГУМАНІТАРНУЮ ДАПАМОГУ З ЗША

З 1 сьнежня гэтага года па 1 траўня наступнага ў Беларусі плануецца правесьці чарговую буйнамаштабную акцыю «НАДЗЕЯ-ЭКСПРЭС - 4». Тры папярэднія аналагічныя мерапрыемствы былі праведзены ў 1992-1994 гг. Мэта гэтай акцыі - аказаньне гуманітарнай дапамогі насельніцтву Беларусі, а таксама садзейнічаньне ў стварэньні і пашырэньні эфектыўнага ўнутранага рынку. Фундатарамі мерапрыемства выступаюць амерыканская арганізацыя «СІЦІХОУП ІНТЭРНЭШНЛ» і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчаваньня Беларусі. Чакаецца, што ў межах правядзеньня гэтай акцыі з ЗША для малазабясьпечаных жыхароў Беларусі надыйдзе вялікая колькасьць прадуктаў харчаваньня на суму 2,5 мільёна долараў.

ЛІТОЎСКІЯ ЎЛАДЫ ВЫЗВАЛІЛІ БЕЛАРУСКАГА КАМУНІСТА

20 лістапада літоўскія ўлады пад заклад у 5 тысяч долараў вызвалілі беларускага грамадзяніна Івана Кучарава, які з 1993 года знаходзіўся ў літоўскай турме за спробу ў студзені 1991 года зьвяржэньня законнага Ураду Летувы.

Каментуючы вызваленьне свайго таварыша па партыі, адзін з лідараў беларускіх камуністаў Віктар Чыкін заявіў: «Мы дзякуем беларускаму прэзідэнту за тое, што ён зьвярнуўся да праблемаў камуністаў тварам. Хадайніцтва Лукашэнкі па вызваленьню Кучарава яшчэ раз сьведчыць, што Лукашэнка наш чалавек»

СІМ

ЗЮГАНАЎ ЗА АДНАЎЛЕНЬНЕ ВЯЛІКАГА САЮЗУ

Добра вядомы ўсім правадыр камуністаў Расеі Зюганаў нядаўна выказаўся за аднаўленьне вялікага Саюзу, але не адразу. Ён паведаміў, што маецца канцэпцыя паэтапнага аб'яднаньня, якое будзе праходзіць, без прымяненьня сілы. Спачатку далучацца Беларусь, потым Украіна і Казахстан на эканамічнай аснове.

«Расея нікога сілком заганяць ня будзе, але магчымы эканамічны ціск» - лічыць сп.Зюганаў.

С.Гарадзенскі.

ЗАМЕСТ СЫНА - 11 МІЛЬЁНАЎ

Адзінаццаць мільёнаў расейскіх рублёў... Ці пераканаюць яны беларускае грамадзтва ісьці ў абдымкі да Расеі?

Гэткую суму атрымалі бацькі Кулінковічы з г. Смалявічы за забітага сына ў Чачні, якога сюды прывезьлі ў труне 12.IX-95 г. Так, шкада маладога хлопца (асабіста знаёмы з яго бацькамі), а тым больш, за што загінуў далёка ад Беларусі, чые інтарэсы ахоўваў ён у Чачні? Ніякай пагрозы народ Чачні нікому з беларусаў не прад'яўляў, што беларус пайшоў забіваць іх, гэткіх самых, як ён.

Ці ня будзе так, што і чачэнец пойдзе забіваць на Беларусі беларусаў? І вынік, плача чачэнская маці па сваім забітым сыне нашымі беларусамі, плача і беларуская маці, што і яе сына забілі ў Чачні. Колькі іх, беларусаў, у трунах прывезьлі з Аўганістана, а цяпер вязуць з Чачні! Няўжо ў нас, беларусаў, гэткі розум вузкі, што служым імперыі рускай. Дык паслухайце,браточкі, гэткае вось парады, палюбіце свае куточкі, мову, строй, абрады.

у.Гардзейка, пеньсіянер, ветэран працы.

СВАБОДУ ДЛЯ БЕЛАРУСІ!

У той час, як нашае грамадзтва паступова каціцца да стану жабрацкай абыякавасьці да ўсяго, акрамя капейкі на хлеб, нашыя суайчыньнікі, якія воляй лёсу апынуліся за мяжой, ня могуць зьмірыцца з тым, што адбываецца ў нашай краіне. І гэта ня дзіўна, бо людзі, спазнаўшыя волю, ніколі ня зьміряцца з няволей другіх людзей. Тым больш - суайчыньнікаў. Яскравым сьведчаньнем гэтага зьяўляецца пратэст Тэрытарыяльнай Рады беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня ў Ольштыне супраць дзейнасьці прэзідэнта Лукашэнкі ў суверэннай Беларусі, надрукаваны ў адным з нумароў «Dziennika pojezierza». У ім, між іншым, гаворыцца:

«Тое, што чыніць прэзідэнт у вольным краі, Беларусі, ня месьціцца ў галаве. Можа, прэзідэнт хоча распачаць другую Чачню? Так робяць толькі расейскія нацыяналісты. Гэты шлях нікуды не прывядзе, шаноўны спадар прэзідэнт!

Больш волі і дэмакратыі!Вольная Беларусь пад штандарамі Пагоні!»

В.М.

ТВАР УЛАДЫ

Шаноўнае спадарства! Прапануем вашай увазе новую рубрыку, якая , маем надзею, спадабаецца вам і зойме сваё месца на старонках «Пагоні» ў Новым годзе. У гэтай рубрыцы мы будзем знаёміць чытачоў з людзьмі ўлады, якім мы даверылі свой лёс. Пры гэтым найперш будзем імкнуцца паказаць іх зямное жыцьцё, але і пытаньням, зьвязаным з пасадай, працай, таксама знойдзецца месца.

*Героем нашай прэзэнтацыі мы абралі **Міколу Кавальчука** - старшыню гарадзкога Савету Ваўкавыска.*

У далейшым пры выбары чарговых «твараў» «Пагоня» будзе кіравацца прапановамі чытачоў, а таму чакаем вашых водгукаў і пытаньняў да тых людзей, інтэрв'ю з якімі вы хацелі б убачыць у новай рубрыцы газеты. Чакаем вашых лістоў!

МІКОЛА КАВАЛЬЧУК: «ХАЧУ БАЧЫЦЬ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ ШЧАСЬЛІВЫМІ!»

Дасье


Нарадзіўся 11 верасьня 1959 года ў вёсцы Пагор'е Івацэвіцкага раёну. Служыў у групе савецкіх войскаў у Германіі. Пасьля службы ў 1980-84г. вучыўся ў Менскім педінстытуце на факультэце фізікі. Па разьмеркаваньню трапіў у Ваўкавыск. З 1984 па 1993 год выкладаў фізіку і інфарматыку ў педвучылішчы. З 1990 года - намесьнік старшыні гарсавету. З 1995 года - старшыня Савету. Жанаты. Мае двух сыноў.

МІКОЛА АКСАМІТ, дэпутат Вярхоўнага Савету, горад Ваўкавыск.

- Я ведаю Міколу з 1989 года. Гэта на самой справе сумленны чалавек з новымі ідэямі і поглядамі. Менавіта такія людзі сёньня і павінны быць пры ўладзе.

ІВАН ГАЛАСКОК, дэпутат абласнога Савету, горад Ваўкавыск.

- Мікола - чалавек гонару, чалавек слова, ведае мэту і шляхі яе дасягненьня, добры арганізатар, вакол якога гуртуюцца людзі.



- Мікола што зьвязвае Вас зараз з тымі мясьцінамі, дзе Вы нарадзіліся? Якія найбольш яркія ўспаміны з дзяцінства праходзяць зараз праз памяць?

- Бацькі мае пераехалі ў Баранавічы, у вёсцы засталася толькі радня. Бываю там, на жаль, вельмі рэдка. А што датычыцца ўспамінаў, то прыходзіць на памяць «Родны кут» Якуба Коласа. Лепш пра родныя мясьціны ня скажаш.

- Які ўплыў на Ваш далейшы лёс зрабілі студэнцкія гады?

- Яны дапамаглі мне сфармавацца як асобе, лепш зразумець сутнасьць навакольнага сьвету. Дапамагло й тое, што служыў я ў Германіі, затым месяц там жа разам з іншымі студэнтамі быў на стажыроўцы і мог параўнаць узровень жыцьця там і ў нас. У студэнцкім асяродку ўжо тады лунала думка, што ня ўсё ў гэтым сьвеце нармальна.

- Пры якіх акалічнасьцях пазнаёміліся з будучай жонкай?

- З Галінай я пазнаёміўся ў інстытуцкім прафілакторыі. Мы жылі там у суседніх пакоях. Гэта было дзесьці на трэцім курсе. Скончыўшы інстытут на год пазьней за мяне, яна прыехала да мяне ў Ваўкавыск, дзе мы й ажаніліся.

- Пад час нашых сустрэч вы неаднойчы падкрэсьлівалі, што ўвесь свой вольны час імкнецеся аддаваць дзецям...

- А як жа можа быць інакш? У каго яшчэ ўкладваць усё найлепшае, чым валодаем, як не ў сваіх дзяцей? Гэта наша будучыня, і якой мы яе створым, так і будзем жыць. Заўсёды, як маю час, я - з сынамі. Зараз разам чытаем «Чатыры танкісты і сабака» . Я люблю нешта паяць, займацца радыётэхнікай, і дзеці разам са мною. На жаль, часу на выхаваньне дзяцей зараз вельмі мала.

- Як ставіцца да гэтага жонка?

- Калі нехта займаецца сёньня палітыкай, дык толькі з добрага блаславеньня жонкі ды з яе дапамогай і падтрымкай...

- Ці зьмяніліся адносіны сяброў, калі Вы сталі чалавекам улады?

- Спачатку некаторыя сапраўды па звычцы лічылі, што там, дзе пачынаецца ўлада - скончваецца сяброўства. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі чалавек пачынае паводзіць сябе несумленна. Нягледзячы на тое, што з сябрамі сустракаюся ня так часта, як раней, я заўсёды з імі. І яны вельмі добра да гэтага ставяцца.

- А як увогуле адбыўся твой прыход да ўлады?

- Я пад час працы ў педвучылішчы стварыў суполку, якая напярэдадні выбараў 1990 года пераўтварылася ў Клуб дэмакратычных выбараў. Наш клуб тады меў рэальны ўплыў у горадзе. Нашыя кандыдаты прайшлі ў Вярхоўны, абласны і гарадзкі Саветы. У апошні - 16 чалавек. На першай сесіі, калі разглядалася пытаньне аб намесьніку старшыні Савету, яны прапанавалі на гэтую пасаду маю кандыдатуру: На дзіва, мяне падтрымалі.

За гэтыя пяць гадоў зьмяніліся чатыры старшыні Савету. Тройчы рабіліся спробы зьняць і мяне, але большасьць дэпутатаў мяне падтрымала. З утварэньнем «вертыкалі» на мяне былі ўскладзеныя абавязкі старшыні гарсавету якія я зараз і выконваю.

- Ці ёсьць у Ваўкавыску ўлада Саветаў?

- Адназначна - няма! Збор кожнай сесіі патрабаваў аграмадных высілкаў. Трэба было кожнаму тэлефанаваць, асабіста запрашаць. Большасьць дэпутатаў проста забылася, дзеля чаго іх абіралі. Калі і прыймаліся нейкія рашэньні - пракантраляваць іх выкананьне выканкамам фактычна не было магчымасьці.

- Сярод кандыдатаў у дэпутаты на гэтых выбарах твайго позьвішча не было. Што гэта - расчараваньне, пратэст, ці...

- Няма ня толькі майго прозьвішча, але і маіх паплечнікаў. Каб лягчэй было жыць, каб нікому не перашкаджалі, дастаткова было проста нас не зарэгістраваць. Так было ў траўні, так сталася й у лістападзе. Першы раз мы ішлі ад ТБМ і нам адмовілі ў рэгістрацыі таму, што вылучэньне адбылося на сходзе, а не на канферэнцыі. Зараз фармальнай прычынай было тое, што Гарадзенская філія БСДГ (сябрам гэтай партыі я зьяўляюся) не зарэгістраваная ў Ваўкавыску. Прычыны сьмешныя. Мы зьвярталіся ва ўсе інстанцыі. Асабіста я размаўляў са старшынём Цэнтрвыбаркаму Абрамовічам, аднак безвынікова.

Тым ня менш, вялікага расчараваньня ў мяне няма, я быў падрыхтаваны. Я ведаю, што зараз узьнікнуць праблемы з працаўладкаваньнем. Мы не зьбіраемся адыходзіць ад актыўнай дзейнасьці, бо тым, хто пойдзе па нашаму шляху, зноў прыйдзецца пачынаць усё спачатку. Я ўпэўнены, што лепшыя часы яшчэ на перадзе.

- Назавіце,калі ласка, па адной найважнейшай падзеі ў жыцьці краіны, горада і сваім асабістым за гэты год.

- Для краіны - рэферэндум. Яго вынікі я ўспрыняў напачатку вельмі балюча. Часамі думалася нават, што такі народ такіх вынікаў і заслугоўвае. Але хутка прыйшло разуменьне таго, што справа не ў народзе, а ва ўрадзе. Быў бы іншы ўрад - быў бы зусім іншы вынік.

У жыцьці горада такой падзеі, бадай што, не было .

А ў сваім асабістым? - Нарэшце мая сям'я атрымала кватэру, і мае дзеці нарэшце сьпяць паасобку на розных ложках, пра што даўно марылі.

- Што б Вы пажадалі сабе ў Новым годзе?

- У першую чаргу, каб мае дзеці пачалі жыць у нармальнай цывілізаванай краіне, нармальным чалавечым жыцьцём, каб яны проста былі шчасьлівымі.

Гутарыў Вітаўт Руднік.

ВОЛЯ ДА РАЗЬВІЦЬЦЯ

27 лістапада ўпраўленьне юстыцыі гарадзенскага аблвыканкаму зарэгістравала новую грамадзкую арганізацыю. Рэгіянальная Асацыяцыя садзейнічаньня фармаваньню адкрытага грамадзтва «Воля да разьвіцьця» будзе дзейнічаць на тэрыторыі Слонімскага, Дзятлаўскага і Зэльвенскага раёнаў і мае на мэце папулярызацыю ідэі адкрытага грамадзтва, разьвіцьцё мясцовага самакіраваньня, эканамічных рэформаў, духоўнага і культурнага адраджэньня, рэгулярны ўзаемны абмен інфармацыяй па праблемах Слонімскага раёну з рознымі грамадзкімі супольнасьцямі.

Зьяўленьне такіх грамадзкіх арганізацый ня можа ня радаваць: людзі пазбаўляюцца комплексаў непаўнавартасьці і спрабуюць самі рэальна вырашыць свой лёс. А гэта азначае, што эпоха таталітарызму набліжаецца да краху, нягледзячы на ўсе намаганьні «сьпіралі».

В.М.

ФАЛЬКЛОРНЫ ФЕЕРВЕРК

Можна колькі заўгодна плявузгаць пра «дружбу славянских народов», пра «исконное единство и братство», а можна зладзіць сьвята нацыянальных культураў без усялякай палітычнай ангажаванасьці, проста і натуральна. 26 лістапада ў Палацы культуры хімікаў адбыўся ІІ гарадзкі фестываль нацыянальных абрадаў, які стаўся менавіта такой імпрэзай.



Напоўніцу запруджаная зала цёпла і прыхільна вітала самадзейныя калектывы з розных устаноў. Арганізатары нябблага папрацавалі канцэптуальна - амальпяцігадзінная праграма складалася з чатырох сезонных блокаў: каляднага, веснавога, летняга і восеньскага. Трэба занзначыць, што фіналу папярэднічаў адборачны тур на мейсцах. У выніку 14 найбольш адметных творчых калектываў дэманстравалі ў нядзелю свае здольнасьці. З нацыянальных меньшасьцяў бралі ўдзел ансамблі са Зьвёнзку палякаў і Татарскага таварыства. Сьпектр паказанага ўвабраў у сябе як рэлігійна-каляндарныя, так і сямейна-бытавыя абрады, народныя танцы, паказкі і прымаўкі. Гледачы ўбачылі сапраўдны фальклорны феерверк, музычна-сьпеўны карагод.

Прыязна сустрэты былі і госьці са Смаленску /яны ўдзельнічалі па-за конкурсам/ - падлеткавы ансамбль з характэрнай назвай «Крывічата».

Журы сутыкнулася з пэўнымі цяжкасьцямі, вызначаючы лепшых сярод дыпламантаў. Урэшце, лаўрэатамі былі абвешчаны ўзорны калектыў «Дударыкі» з «Калядньмі віншаваньнямі», дзяржуніверсітэт з абрадам «Купальле», татарскае Таварыства з «Восеньскімі вячоркамі» і СШ N 20 з беларускімі «Хрэсьбінамі». Прграму настаўнікаў 20-й школы Васіль ЛІЦЬВІНКА (старшыня Асацыяцыі фалькларыстаў Беларусі) вылучыў асобна, назваўшы яе вартай тэлевізійнага запісу. Безумоўна, выдатнай адзнакі заслугоўваюць СШ N 5 /дзеці прадставілі ўнікальны Пакроўскі кірмаш, у якім было задзейнічана звыш 40 чалавек/, СШ N 19 і 26. Зрэшты, астатнія ўдзельнікі таксама прадэманстравалі сваю самавітасьць.

Фэст выклікаў сапраўды сьветлыя пачуцьці. Калі ў многіх рэгіёнах былой вялізнай краіны ідуць калатнечы і панующь сваркі, на Беларусі абуджаюцца праявы нацыянальных народных культураў. Час запатрабаваў ужо да Адраджэньня некаторыя зьявы, што былі характэрны для нашага люду ў часіны вольнасьці, паўнавартаснай дзяржаўнасьці. І будзем верыць, што гэта незваротна.

Ладзік МАЙНІЧ.



На здымках: Граюць "Дударыкі", танцуюць "Лехіці"
Фота Я.Ванюкевіча.



Праграма тэлеперадач

Панядзелак, 4 сьнежня

Белорусское телевидение

16.40 ТВ - школе. 4-й класс. Моя Родина - Беларусь. Древние белорусские города. 17.05 Параграф. Минский центр занятости населения. 17.35 «На добрый лад». Телеочерк. Передача из Бреста. 18.00 Музыкальный антракт. 18.10 Всемирные новости (Би-би-си, Си-эн-эн). 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 Новости (с сурдопереводом). 19.10 Белорусский дом. Художественно-публицистическая программа. 19.50 Портрет в интерьере. Генеральный директор Акционерного предприятия «Крыніца» Владимир Бодров. 20.10 Спортивный телекурьер. 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. Информационно-аналитическая программа. 22.05 «Фильмотека». «Укротительница тигров». Худ. фильм. 23.40 Новости. 23.55 Экономикст. 0.05 Под куполом Вселенной. **ГРОДНО**: 18.00 Дневник Принеманья. 18.10 Разговор по случаю. 18.30 Семейный понедельник.

ОРТ

17.20 «Тропиканка». Сериал. 18.05. Выборы-95. 18.35 «Угадй мелодию». Телеигра. 19.00. «Мы». Авторская программа В.Познера. 19.45. «Спокойной ночи, малыши!» 20.00 Время. 20.45 «Электоронные жучки-10». 21.50. «Серебряный шар». Ведущий - В.Вульф.

Канал «Россия»

16.45 Спасение 911. 17.40 Выборы-95. Государственная Дума. 18.10 Никто не забыт. 18.15 Клуб избирателей. 18.25 Устами младенца. 19.00, 22.00 Вести. 19.25 Подробности. 19.35 «На круги своя». Худ.фильм. Часть 1-я. 20.45 Репортер. 21.10 «К.Симонов и В.Гроссман: сын и пасынок». Программа Л.Аннинского. 21.50 Премьера видеоклипа. Н.Караченцов. «Усталый огонь». 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 22.55 Партия халявы. 23.15 «Гонка за жизнью». Худ.фильм. 5-я серия.

Санкт-Петербург

12.00, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 Стиль жизни. 12.25, 14.45 Музыкальный момент. 12.30 «Немецкая волна». 12.45 Мультфильм. 13.00 Скорая помощь. 13.30 «Мануэла». Худ. фильм. 14.20 Советы садоводам. 14.30 Овертайм. 16.30 «Европейский калейдоскоп». 17.00 20.00 Выборы-95. 17.40 Крестики-нолики. 18.05 Телемагазин. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 19.00 «Мануэла». Худ. фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 21.00 «И грянул бал...» Фрагмент из оперы П.И.Чайковского «»Евгений Онегин». 21.10 «Русский Эсхил Петера Штайна». Передача 2-я. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 Парад парадов. Музыкальное шоу.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 09 30 Телетурнир для детей. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Дошкольники дома. 10 50 Гимнастика. 10 55 Поговорим о детях. 11 05 «Доктор Квинн». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Программа для животных. 12 20 Малый взгляд. 12 30 Танец и скульптура. 12 50 Программа о поэзии. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Экономическая программа. 13 40 Начинаем. 13 45 Безжалостная камера. 13 55 Документальный фильм. 14 25 Сила традиции. 14 40 Польский джаз 50-х. 15 10 Знаешь ли что... 15 15 Энциклопедия второй мировой войны. 15 35 Тайная история СССР. 15 50 Программа на вечер. 16 00 Для молодых зрителей. 16 30 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 17 00 Альтернативы. 17 25 Для детей. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Публицистическая программа. 19 10 «Марфи Браун». Сериал пр-ва США. 19 35 Краткий курс истории. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 Телетеатр. 22 30 Пульс дня. 22 45 Неделя президента. 22 55 Миниатюры. 23 00 Тележурнал. 23 40 Полицейский журнал. 00 00 Новости. 00 15 «Гостиница Нью-Хампшайр». Фильм пр-ва США. 02 00 Развлекательная программа.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Морк и Минди». Сериал пр-ва США. 10 00 Мир женщин. 10 30 Дикие горизонты. 11 00 Кроссворд. 11 25 Телетурнир. 11 50 Летный журнал. 12 20 Сообщество в культуре. 13 00 Документальный фильм. 13 50 Академия здоровья. 14 00 Панорама. 14 20 «Хардкастл и Маккорник». Сериал пр-ва США. 15 10 Музыкальный журнал. 15 40 Музыкальные новости. 15 55 Приветствие. 16 00 Мультсериал. 16 30 Спортивное хобби. 17 00 Военная программа. 17 30 Репортаж. 18 00 Развлекательная программа. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Колесо фортуны. 20 30 Программа для детей. 21 00 «Шутки в сторону». Сериал пр-ва Англии. 21 35 Автожурнал. 22 00 Панорама. 22 40 «Остановка Аляска». Сериал пр-ва США. 23 25 Сад искусств. 00 00 Тележурнал. 00 30 Зов о помощи. 01 00 Панорама. 01 05 Возвращение композитора.

Аўторак, 5 сьнежня

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Зеркало Си-эн-эн. 8.20 Авто-парк. 8.35 Финансовый час. 8.50 «Колесо судьбы». Киноочерк. 9.00 ТВ - школе. 4-й класс. Моя Родина - Беларусь. Древние белорусские города. 9.25 Мультфильм. 9.35 Бездельник. 10.05 Уроки Н.Новожиловой. 10.35 Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых. 10.55 К 25-летию Государственного театра музыкальной комедии Беларуси. Имре Кальман. Оперетта «Сильва». 13.45 По вашим просьбам. «Россия молодая». Худ.фильм. 1-я серия. 15.00 Новости. 15.10 Торговый дом. 15.25 ТВ - школе. 3-й класс. Музыкальные знаки препинания. 15.45 Мультфильм. 16.10 Пригласительный билет. Ансамбль народной музыки «Встреча». Передача из Гомеля. 16.35 «Вера, Надежда, Любовь». Драматург А.Делендик. 17.15 Обновление. Отраслевая наука: состояние и перспективы. 18.00 Музыкальный антракт. 18.10 Всемирные новости (Би-би-си, Си-эн-эн). 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 Новости (с сурдопереводом). 19.10 Звезды белорусского балета. Памяти С.Дречина. 19.35 На рубеже столетий. Белорусская эмиграция в Америке. 20.30 Скрижали. Экклезиаст. 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. Информационно-аналитическая программа. 22.05 «Путь героина». Худ.фильм (Великобритания). 1-я серия. 23.05 Новости. 23.20 Экономикст. 23.30 Под куполом Вселенной. 23.35 Футбол. Чемпионат Англии. Премьер-лига. «Уимблдон»-»Ньюкасл». **ГРОДНО**: 17.55 Дневник Принеманья. 18.05 Так говорит Библия. 18.40 Двадцать минут с надеждой.

ОРТ

5.00 Телеутро. 7.30 Выборы-95. 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Новости. 8.15 «Тропиканка». Сериал. 9.00 «Мы». Авторская программа В.Познера. 9.45 Смехопанарама. Ведущий - Е.Петросян. 10.15 «Мартышка и смычки». Мультфильм. 10.30 «Угадай мелодию». Телеигра. 11.10 Телерадиокомпания «Мир». 14.20 «Виджит спешит на помощь». 14.40 Квартет «Веселая квампания». 14.50 Мультитроллия. 15.10 Волшебный мир, или Синема. 15.35 «Элен и ребята». Молодёжный сериал. 16.00 ...До шестнадцати и старше. 16.30 Семь дней спорта. 17.20 «Тропиканка» Сериал. 18.05 Выборы-95. 18.35 «Угадай мелодию». Телеигра. 19.00 Тема 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 20.00 Время. 20.45 Фильм А.Германа « Мой друг Иван Лапшин». 22.40 Москва - Кремль. 23.10 Телешоу «50 х 50».

Канал «Россия»

6.30 Время деловых людей. 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Требуются... требуются... 7.30 Звезды говорят. 7.35 Ритмика. 7.50 Всего понемногу. 8.30, 17.40 Выборы-95. Государственная Дума. 9.00 Телегазета. 9.05 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 10.20 Милицейская хроника. 10.30 Ваш партнер. «Газпром». 10.50 Ключевой момент. 11.00 Музыкальный экспромт. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Музыкальный класс. 15.50 Месяцеслов. 16.20 Телемарафон «Шаги Победы». 17.05 Киноафиша. 17.20 Ваш партнер. 18.10 L-клуб. 19.25 Подробности. 19.35 Клуб избирателей. 19.45 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 20.45 Нос. Развлекательная программа. 21.25 Астрология любви. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 22.55 Игры. 23.15 «Гонка за жизнью». Худ.фильм. 6-я серия. 0.05 Экран криминальных сообщений.

Санкт-Петербург

12.00, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 Стиль жизни. 12.25, 14.30, 21.00 Музыкальный момент. 12.30 «Немецкая волна». 12.45 Мультфильм. 13.00 Скорая помощь. 13.30 «Мануэла». Худ.фильм. 14.20 Советы садоводам. 16.25 «Кино от лета и до лета». Док. фильм. 16.50 По всей России. 17.00, 20.00 Выборы-95. 17.40 Показывает Ленинградская областная телекомпания. 18.00 Телемагазин. 18.05 Телеблиц. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 19.00 «Мануэла». Худ.фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 21.10 «Консерватор». Программа Игоря Масленникова. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 «В светлую лунную ночь». Худ. фильм (Италия). 1-я серия.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Альберт - пятый мушкетер». Мультсериал. 09 30 Программа для детей. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Гимнастика. 10 50 Дошкольники дома. 10 55 Поговорим о детях. 11 00 «Бруклинский мост». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Рынок труда. 12 20 Люди - лягушки. 12 30 Киножурнал. 12 50 Домашний юрист. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Сельскохозяйственная программа. 13 45 Компьютерная школа. 14 00 Документальный фильм. 14 25 Фантастические повести. 14 40 Кухня. 14 55 Атом, звезды. жизнь. 15 10 Счет математики. 15 20 Книга незнаний. 15 50 Программа на вечер. 16 00 Музыкальная программа. 16 30 «Новые приключения Черного князя». Сериал пр-ва Англии. 17 00 Для молодежи. 17 25 Тик-так. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Чили - диктатура Пиночета. 19 00 «Пани с мокрой головой». Сериал пр-ва Польши. 19 30 Чрезвычайный пересмотр. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 «Луч солнца зимой». Фильм пр-ва Франции. 22 45 Пульс дня. 23 00 Сеймограф. 23 10 Тележурнал. 23 20 Экономическая публицистика. 00 00 Новости. 00 20 Документальный фильм. 01 35 Жизнь моя. 02 35 Репортаж.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Утренний гость. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Фитнесс клуб». Сериал пр-ва Польши. 10 00 Мир женщин. 10 30 Документальный сериал. 11 00 Программа для детей. 11 25 Телетурнир. 11 50 Путешествие во времени и пространстве. 12 45 Спортивная студи. 13 05 Повторение по заявкам. 13 50 Академия здоровья. 14 00 Панорама. 14 20 «Запретная любовь». Сериал пр-ва Испании. 15 10 Музыкальный журнал. 15 45 Музыкальные новости. 15 55 Приветствие. 16 00 Сериал пр-ва Австралии. 16 30 Спортивная студия. 17 00 Документальный фильм. 17 30 Телетурнир. 18 00 Тележурнал. 18 10 В тени Кремля. 18 35 Католическая программа. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Телетурнир. 20 35 Программа для детей. 21 00 Развлекательная программа. 21 50 Спортивная программа. 22 00 Панорама. 22 30 Тележурнал. 22 35 Экологическая программа. 22 45 Репортеры представляют. 23 05 «Моя маленькая девочка». Фильм пр-ва США. 01 00 Панорама. 01 05 "Эления». Фильм пр-ва Англии.

Серада, 6 сьнежня

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Зеркало Си-эн-эн. 8.20 Мультфильмы. 9.00 ТВ - школе. 3-й класс. Музыкальные знаки препинания. 10.20 Видимо-невидимо. 11.20 «Золотые ключи».1 Республиканский телевизионный фестиваль народного творчества. Часть 1-я. 12.45 «Россия молодая». Худ.фильм. 2-я серия. 15.00 Новости. 15.10 Классика на экране. «Лебединое песня», «На даче». Короткометражные худ. фильмы. 16.05 Так это было... «А мы с тобой, брат, из пехоты»... 16.25 Голоса прошлого. Фестиваль «Возрождение белорусской капеллы». 17.10 В обьективе - Голландия. Передача из Бреста. 17.35 Рельсы общие. Интересы личные. Союз железнодорожников действует. 18.00 Музыкальный антракт. 18.10 Всемирные новости (Би-би-си, Си-эн-эн). 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 Новости (с сурдопереводом). 19.10 Кредо. 19.25 «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. 19.55 Класс-клуб. Гость программы артист Александр Панкратов-Черный. 20.25 Лотерея «Олимпия». 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. Информационно-аналитическая программа. 22.05 «Путь героина». Худ.фильм (Великобритания). 2-я серия. 23.05 Новости. 23.20 Экономикст. 23.30 SOS. Криминальная хроника. 23.40 Под куполом Вселенной. 23.45 Рок-корона - 95. Группа «Крама». **ГРОДНО**: 17.55 Дневник Принеманья. 18.05 По существу. 18.25 «Гарадніца». Художественная программа.

ОРТ

5.00 Телеутро. 7.30 Выборы-95. 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости. 8.15 «Тропиканка». Сериал. 9.00 Тема. 9.45 «Серебряный шар». Ведущий - В.Вульф. 10.30 «Угадай мелодию». Телеигра. 11.10 Телерадиокомпания «Мир». 14.20 «Виджит спешит на помощь». Мульсериал. 14.40 Кактус и К. 14.50 До-ми-соль. 15.10 Зов джунглей. 15.35 «Элен и ребята». Молодёжный сериал. 16.00 Тет-а-тет. 16.30 Семь дней спорта. 17.20 2Тропиканка». Сериал. 18.05 Выборы-95. 18.35 «Угадай мелодию». Телеигра. 19.00 «В поисках утраченного». Ведущий - Г.Скороходов. 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 20.00 Время. 20.45 «Один на один». Спецвыпуск. 21.20 Футбол. «Легия» (Варшава) - «Спартак» (Москва). 23.30 Футбол. Лига Чемпионов. Обзор . матчей.

Канал «Россия»

6.00, 8.30, 17.40, 22.50 Выборы-95. Государственная Дума. 6.30 Время деловых людей. 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Требуются...требуются... 7.30 Звезды говорят. 7.35 Ритмика. 7.50 Всего понемногу. 8.10 Крестьянский вопрос. 9.00 Телегазета. 9.05 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 10.20 Милицейская хроника. 10.30 «Судьбы». Фильм 7-й. 10.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 11.15 Новая линия. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Чья сторона? 16.20 Дальний Восток. 16.50 «Камень сновидений». Мультсериал. 17.15 Купить - не купить. 17.25 Вас приглашает фирма «Савва». 18.10 Клуб избирателей. 18.25 Своя игра. 19.25 Подробности. 19.35 «Санта-Барбара». Худ.фильм. 20.35 От форте до пьяно. 21.10 Чрезвычайный канал. 22.30 Река времени. 22.35 Автомиг. 22.40 Служба 299-00-00. 23.25 Поляки сделали выбор. 23.40 «Прощание осени». Худ. фильм (Польша).

Санкт-Петербург

12.00, 18.30, 21.45 Информ ТВ. 12.10 Стиль жизни. 12.25, 14.30, 17.40, 21.00 Музыкальный момент. 12.30 «Немецкая волна». 12.45 Мультфильм. 13.00 Скорая помощь. 13.30 «Мануэла». Худ.фильм. 14.20 Советы садоводам. 16.10 Детское ТВ. Ребятам о зверятах. 16.40 Три колеса. фолиант и ... 17.00, 20.00 Выборы-95. 17.45 «Шесть граней удачи». Телеигра-лотерея. 18.00 Телемагазин. 18.05 Телеблиц. 18.10 Большой фестиваль. 18.50 Спортивные новости. 19.00 «Мануэла». Худ.фильм. 19.50 Телеслужба безопасности. 21.05 Блеф-клуб. 22.00 Спорт, спорт, спорт... 22.15 «Золотой телец». Развлекательная программа. 23.05 «В светлую лунную ночь». Худ. фильм (Италия). 2-я серия.

Польское телевидение

Программа 1

07 00 Кофе или чай? 08 45 Беседа. 09 00 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 09 30 Программа для детей. 09 45 Времена года. 10 00 Новости. 10 10 Мама и я. 10 25 Гимнастика. 10 30 Дошкольники дома. 10 55 Поговорим о детях. 11 00 «Слава». Сериал пр-ва США. 11 50 Музыкальная программа. 12 00 Тележурнал. 12 15 Рыбы и рыбки. 12 30 Жизнь моя. 13 00 Новости. 13 10 Агробизнес. 13 15 Сельскохозяйственная программа. 13 40 Орфография. 14 00 Большая история малых городов. 14 30 Путешествие за горизонт. 15 10 Угадай, выскажись. 15 15 Сериал пр-ва Англии. 15 25 Люмен 2000. 15 50 Программа на вечер. 16 00 Музыкально-поэтический журнал. 16 30 «Мода на успех». Сериал пр-ва США. 17 00 Для молодежи. 17 25 Для детей. 18 00 Телеэкспресс. 18 20 Телетурнир. 18 50 С камерой среди зверей. 19 10 «Солнечный патруль». Сериал США. 20 00 Вечеринка. 20 30 Новости. 21 10 Спортивная студия. 23 30 Пульс дня. 23 45 Тележурнал. 00 00 Новости. 00 20 «Шах». Фильм пр-ва США. 02 30 Люмен 2000.

Программа 2

08 00 Панорама. 08 10 Спортивная программа. 08 20 Новости. 08 50 Академия здоровья. 09 00 Местная программа. 09 30 «Все, кроме любви». Сериал пр-ва США. 10 00 Мир женщин. 10 30 Каждая минута детям. 11 05 За умом к голове. 11 30 Телепредставление для детей. 11 40 Повторение по заявкам. 13 20 Телепредставление для детей. 13 30 Мой маленький мир. 13 50 Академия здоровья. 14 00 Панорама. 14 20 Сериал пр-ва Италии. 15 05 Телепредставление для детей. 15 20 Музыкальный журнал. 15 50 Приветствие. 16 00 Мультсериал. 16 30 Пейзажи польской деревни. 16 50 Телепредставление для детей. 17 00 Животные вокруг нас. 17 30 Телетурнир. 18 00 Документальный фильм. 18 45 Телепредставление для детей. 18 55 Розыгрыш лото. 19 00 Панорама. 19 10 Местная программа. 20 05 Колесо фортуны. 20 35 Программа для детей. 21 00 «Ближайшая встреча». Фильм пр-ва Англии. 22 00 Панорама. 22 35 Экспресс репортеров. 23 05 Телетеатр. 00 00 Спортивная студия. 01 00 Панорама. 01 05 Конкурсная студия.

Чацьвер, 7 сьнежня

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Зеркало Си-эн-эн. 8.20 Мультфильм. 8.30 «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. 9.00 Уроки Н.Новожиловой. 9.30 «Путь героина». Худ.фильм. 2-я серия. 10.30 К 100-летию мирового кинематографа. «Кинооператор Анатолий Головня». Док.фильм. 11.05 «Золотые ключи». 1 Республиканский телевизионный фестиваль народного творчества. Часть 2-я. 12.40 «Микола Гусовский. «Песня про зубра». Телефильм. 15.00 Новости. 15.10 К 65-летию Владимира Короткевича: «Битва при Лесной». Док. фильм. «Паром». Телефильм. 16.10 ТВ - школе. 7-й класс. Белорусская литература. Алексей Дударев. «Вечер». 16.45 Мультфильм. 16.55 Творцы. Композитор Владимир Казбанов. 17.25 Арсенал. Программа для армейцев. 18.00 Музыкальный антракт. 18.10 Всемирные новости (Би-би-си, Си-эн-эн). 18.45 «Трижды один». Музыкальная передача MTV. 19.00 Новости (с сурдопереводом). 19.10 Творческое молодежное об»единение «Крок». «Риск-версия». Телеигра. 19.40 Протокол. Международная программа. 20.00 «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. Информационно-аналитическая программа. 22.05 «Путь героина». Худ. фильм (Великобритания). 3-я серия. 23.05 Новости. 23.20 «Крок». Информационная программа. 23.45 Экономикст. 23.55 Творческое молодежное об»единение «Крок». «Большая Медведица». Кино и видео для молодежи. 0.15 Под куполом Вселенной. **ГРОДНО**: 17.55 Дневник Принеманья. 18.10 По существу. 18.35 Далеко ли выход из кризиса.

ОРТ

5. Телеутро. 7.30 Выборы-95. 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Новости. 8.15 «Тропиканка». Сериал. 9.00 Футбол. «Нант» (Франция) -»Панатинаикос» (Греция). 11.10 Телерадиокомпания «Мир». 14.20 «Виджит спешит на помощь». Мультсериал. 14.40 Лего-го! 15.10 Тин-Тоник. 15.35 «Элен и ребята». Молодёжный сериал. 16. Рок-урок. 16.30 Семь дней спорта. 17.20 «Тропиканка». Сериал. 18.05 Выборы-95. 18.45 Лотто Миллион. 19.10 «Арбатский парламент» - «Включись!» 19.45 «Спокойной ночи, малыши!» 20.00 Время. 20.45 «Бойцовые рыбки». Худ.фильм (США). 22.25 Музобоз.

Канал «Россия»

